3. Османская империя и страны Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы в XVII: в II ч. / Т.Г. Литаврин (отв. ред.) [и др.]. – М.: Памятники исторической мысли, 1998-2001. – Ч. I: Главные тенденции политических взаимоотношений / С.Ф. Орешкова, В.П. Шушарин, Б.Н. Флоря [и др.]. – 1998. – 288 s.
4. Собеский, Я. История Хотинского похода 1621 г. / Я. Собеский // Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси. – Киев, 1896. – Вып. II: Первая половина XVII ст. – С. 40-126.

## АСАБЛІВАСЦІ ХАРЧАВАННЯ РАБОЧЫХ-СТАХАНАЎЦАЎ БССР У СЯРЭДЗІНЕ 1930-х гг.

Субоцін А.А.
(г. Віцебск, УА "ВДУ імя П.М. Машэрава")

Праблема сацыялістычнага спаборніцтва, у тым ліку стаханаўскага руху як адной з яго форм, вельмі падрабязна была адлюстравана ў гістарыяграфіі, дзе асвятляліся пытанні арганізацыі працоўнай дзейнасці, уплыву руху на павышэнне прадукцыйнасці працы, паскарэнне тэмпаў вытворчасці, засяроджвалася ўвага на дзейнасці партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных органаў у разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва ў гады другой пяцігодкі. Гісторыкі амаль не закраналі тэму штодзённасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху, якую можна лічыць адной з характэрных рыс сацыяльнага жыцця 1930- гг..

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца вызначэнне асаблівасцяў штодзённасці рабочых-стаханаўцаў БССР сярэдзіны 1930-х гг. на прыкладзе іх харчавання.

У развіцці стаханаўскага руху партыйнае кіраўніцтва бачыла не толькі аснову для павышэння прадукцыйнасці працы і інтэнсіфікацыі індустрыяльнага будаўніцтва, але і для стварэння заможнага жыцця, паляпшэння быту рабочых. У 1930-х гг. у быце назіраецца тэндэнцыя адмаўлення ад рэвалюцыйнага аскетызму і пераход да грамадства, дзе кожны яго член зможа стаць заможным за кошт актывізацыі сваёй працоўнай дзейнасці. Засяродзім сваю ўвагу на асаблівасцях харчавання стаханаўцаў як аднаго з бакоў штодзённасці, у якой пачало праяўлялася заможнае жыццё.

За кошт павышэння сваёй заработнай платы ў выніку значнага перавыканання норм стаханаўцы маглі сабе дазволіць больш лепшае харчаванне, чым астатнія рабочыя. Стаханавец Віцебскага лесазавода імя "Праўды" Капышка, заробак якога павысіўся ад ранейшых 7 - 8 рублёў у дзень да 25 - 30 рублёў, гаварыў пра сваё харчаванне: "Ні аднаго дня не праходзіць у мяне без мяснога абеда… у мяне ёсць парася, і скора будзе свежае мяса" [1, арк. 47]. Жанчыны-стаханаўкі, на якіх быў ускладзены асноўны клопат па вядзенню хатняй гаспадаркі, адзначалі паляпшэнне харчаванне сваіх дзяцей. Стаханаўка Дземідзенка (Віцебскі шчоткамбінат) з зробленых 406 рублёў за лістапад 1935 г. патраціла на прадукты 269 рублёў. Яна адзначала: "Я пачала добра харчавацца і звяртаю асаблівую ўвагу на харчаванне дзіцяці, каб ён вырас і выхоўваўся ў больш лепшых умовах, чым я" [1, арк. 47]. Адчуўшы паляпшэнне свайго харчавання, стаханаўцы бачылі рэальным станаўленне новага заможнага жыцця, іх штодзённасць, у выніку, супадала з той, якую дэкларавала дзяржава.

Акрамя павышэння заработнай платы, за кошт якой стаханаўцы змаглі палепшыць сваё харчаванне, яны атрымлівалі і шэраг прывілеяў: на

прыдпрыемствах кіраўніцтва арганізоўвала сістэму так званых стаханаўскіх абедаў. Такія абеды адпускаліся ў сталоўках па зніжаных цэнах. На Бабруйскім лесакамбінаце для 60 стаханаўцаў абеды адпускаліся па цане 1 р. 50 к., у той час як для астатніх рабочых – па 2 р. 50к. [2, арк.2], на прадпрыемствах г. Барысава стаханаўцы атрымлівалі скідкі на абеды ў 50 % [2, арк. 97], на заводзе імя Р. Люксембург (Мінск) стаханаўскія абеды былі танней звычайных на 40 к. [2, арк. 99], а на адной з мінскіх фабрык для ўсіх стаханаўцаў абеды ўвогуле былі бясплатнымі [2, арк. 98]. Сістэма стаханаўскіх абедаў прадугледжвала таксама вылучэнне ў сталоўках для перадавікоў спецыяльных сталоў. Гэтыя сталы лепш абслугоўваліся і адпаведна мелі дабраякасны рацыён. Стаханаўцы мелі магчымасць рабіць папярэднія заказы на абеды, што і пастаўляліся на гэтыя сталы (такая сістэма заказаў існавала, напрыклад, па г. Віцебску на фабрыцы гнутай мэблі, фабрыцы імя Лекерта, шчоткамбінаце, фабрыцы імя К. Цэткін) [1, арк. 48]. Арганізацыя асобных сталоў для стаханаўцаў аказала ўплыў на зацвярджэнне іх сацыяльнага статусу як прывілеяванай групы рабочых, а ўнутры аднаго працоўнага калектыву вылучалася асобнае сацыякультурнае асяроддзе. У арганізацыі стаханаўскіх абедаў узнікалі, аднак, і пэўныя праблемы. На шэрагу прадпрыемстваў па прычыне недахопу сродкаў не ўсе рабочыя, што станавіліся стаханаўцамі, атрымлівалі абеды па зніжаных цэнах, а толькі тыя, хто выпрацоўваў самыя высокія паказчыкі ці першым ўключыўся ў рух. На віцебскім заводзе "Чырвоны металіст", напрыклад, пры наяўнасці 180-ці стаханаўцаў таннымі стаханаўскімі абедамі па 50 к. забяспечвалася толькі 60 чалавек. Астатнія стаханаўцы былі незадаволеныя такім становішчам і задалі пытанне адміністрацыі: "Чым мы стаханаўцы хужэйшыя за тых" [2, арк. 115]?

Прывілеяванае харчовае забеспячэнне стаханаўцаў праяўлялася і ў выдзяленні ім спецыяльных пайкоў з нагоды якога-небудзь свята. Так у Бабруйску лепшым стаханаўцам лесакамбіната ў дні кастрычніцкіх свят было даслана 20 харчовых пайкоў, а на швейнай фабрыцы імя Дзяржынскага 15 стаханаўцаў атрымалі харчовыя падарункі на суму 50 р. кожны [2, арк. 2, 203] .

Такім чынам, спецыфіка харчавання стаханаўцаў праявілася ў павелічэнні выдаткаў іх сямейнага бюджэту на ежу за кошт павышэння заработнай платы, грашовых датацыях на набыццё абедаў, атрыманні пайкоў на святы, сістэме стаханаўскіх абедаў. Усё гэта паказвае на вылучэнне стаханаўцаў у асобную элітную групу рабочых, штодзённасць якіх пачынае ўбіраць у сябе элементы заможнага жыцця, пабудову якога на аснове павышэння прадукцыйнасці працы дэкларавала дзяржава.

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф.102, воп. 1, спр. 365.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф.265, воп.1, спр.4207

## ЭТАПЫ ОРГАНИЗАЦИИ «АРХИВНОГО ФОНДА КПСС» ФОРМИРОВАНИЯ СЕТИ ПАРТАРХИВОВ ОБКОМОВ КОММУНИСТИЧЕСКОЙ ПАРТИИ БЕЛОРУССИИ (КПБ)

Буевич Т.В.
(г. Витебск, Государственный архив Витебской области)

Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 29 декабря 1991 г. № 489 комитеты КПБ были ликвидированы, а партийные архивы переданы в ведение Государственной архивной службы (ГАС). В современной исторической науке не нашел широкого отражения тот факт, что в течение нескольких десятилетий как делопроизводство компартии, так и функционирование